**Аддзел адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі**
**Кастрычніцкага раёна г. Гродна**
**Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Гродна”**

**Рэспубліканскі конкурс “Лепшая метадычная распрацоўка музейнага занятку”**

# Намінацыя “Музейная гульня”

# Квэст “Скарбы мінулага”

**Педагог дадатковай адукацыі**
**Сецько Маргарыта Анатольеўна**
**(+375 33 65 763 84)**

**Гродна, 2021**

## ЗМЕСТ

Уводзіны…………………………………………………………………..3

Квэст “Скарбы мінулага”……………..……………………………………….4

Заключэнне………………………………………………………………..9

Гульня «Квэст» праводзіцца ў рамках знаёмства з гісторыяй жыцця беларускага народа канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Каманда ў ходзе гульні выконвае розныя заданні. Удзел у гульні не патрабуе папярэдняй падрыхтоўкі.

Мэта: фарміраванне станоўчай матывацыі для развіцця дынамічнай актыўнасці, стварэнне ўмоў для згуртавання дзіцячага калектыву і замацавання сяброўскіх адносін унутры дзіцячага калектыву.

Задачы:

Адукацыйныя:

1. Развіваць пазнавальную цікавасць, уяўленне, кемлівасць.

Развіваючыя:

1. Садзейнічаць развіццю ўвагі, уседлівасці.

2. Садзейнічаць працы ў групе, камандзе.

2. Выхаваўчыя:

Выхоўваць павагу адзін да аднаго, пачуцце таварыства, фарміраванне ўмення вырашаць канфлікты.

Абсталяванне: маршрутныя лісты, картка з алфавітам азбукі Морзэ, кніга, літары на дошцы, пазлы, карткі з шыфрам, люстэрка, рэбус, экспанаты музея, чысты ліст, асадка, дзіцячыя кубікі з літарамі.

У гульні прымаюць удзел вучні з другога па чацвёрты клас. Каманды фарміруюцца з вучняў аднаго класса. Выбіраецца капітан.

Парадак правядзення гульні.

1. Уводзіны.

Адкрыццё гульні (знаёмства з правіламі гульні, атрыманне маршрутных лістоў).

2. Праца па маршруце (прахаджэнне станцый).

3. Здача маршрутных лістоў. Ідзе разгадванне зашыфраванага слова.

4. Падвядзенне вынікаў гульні. Узнагароджванне.

Працяг гульні – 40-45 хвілін.

Квэст «Скарбы мінулага»

Дзея адбываецца ў вучэбным кабінеце. Дзецям прапануецца знайсці сапраўдны скарб, але спачатку трэба прайсці праз шэраг выпрабаванняў. Настаўнік тлумачыць, што вучням трэба разгадаць восем слоў – назваў экспанатаў у музеі. Дзецям даецца маршрутны ліст і асадка, на якім яны павінны запісаць усе адгаданыя словы, а потым знайсці гэтыя экспанаты ў музеі.

Заданні павінны выконваць у той паслядоўнасці, у якой яны адзначаны ў маршрутным лісце.

Станцыя «Разгадай слова»

Першае слова напісанае шыфрам, але гэта не проста шыфр, а азбука Морзэ. Сістэма кадавання пачала звацца азбукай Морзэ пасля Першай Сусветнай вайны, калі шырока выкарыстоўвалася. І нават сёння ў школах авіяцыі азбуку Морзэ вывучаюць на абавязковай аснове, так як гэта самы даступны спосаб перадаць інфармацыю ў выпадку выхаду тэхнікі з ладу. Таксама азбуку Морзэ вывучаюць у некаторых ваенных вучылішчах.

Дзецям даюцца дзве карткі: на першай алфавіт азбукі Морзэ, на другой – зашыфраванае ёй слова «калыска».

**Азбука Морзе**

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| А | •– | И | •• | Р | •–• | Ш | –––– |
| Б | –••• | Й | •––– | С | ••• | Щ | ––•– |
| В | •–– | К | –•– | Т | – | Ъ | •––•–• |
| Г | ––• | Л | •–•• | У | ••– | Ь | –••– |
| Д | –•• | М | –– | Ф | ••–• | Ы | –•–– |
| Е | • | Н | –• | Х | •••• | Э | ••–•• |
| Ж | •••– | О | ––– | Ц | –•–• | Ю | ••–– |
| З | ––•• | П | •––• | Ч | –––• | Я | •–•– |

Станцыя «Кніжная»

Кніга – духоўны скарб народа. Другое слова мы знойдзем на яе старонках. Вучням даецца кніга і лісток з нумарамі старонак. На кожнай з

выбраных старонак у кола абведзена патрэбная літара, як вынік – слова «сурвэтка».

Станцыя «Збіральная»

Трэцяе слова дзеці павінны сабраць з хаатычна наклеяных на дошцы літар. Складзецца слова «самавар».

Станцыя «Складзі слова»

А ці ведалі вы, што слова «дыван» у беларускай мове па лексічнаму значэнню не адпавядае рускамоўнаму «диван». Насамрэч гэта тканы, звычайна варсісты ўзорчаты выраб для ўпрыгожвання сцен, высцілання падлогі.

Вучням прапаноўваецца скласці пазл, канчатковым малюнкам якога з'яўляецца дыван. А калі карцінка складзена, то трэба яе пакласці адваротным бокам, на якім ужо будзе напісана слова «кош».



Станцыя «Шпіёны»

Зараз мы ператворымся ў сапраўдных шпіёнаў! Для таго, каб ніхто не здагадаўся што напісана ў лісце ці штодзённіке шпіёна ён выкарыстоўваў спецыяльны шыфр, які ведаў толькі сам. Вучням даецца зашыфраванае слова «чыгунок» і алфавіт шыфра.




Станцыя «Люстэркавая»

Вы, мабыць, чулі, што некаторыя народы пішуць справа налева. У мяне для вас незвычайная прапанова: давайце паспрабуем прачытаць наступнае слова пры дапамозе люстэрка! Вучням даецца лісток, на якім зашыфравана слова «сальніца» і люстэрка.



Станцыя «Разгадай рэбус»

Я спадзяюся, што ўсе памятаюць як рашаць рэбусы? А ці ўсе ведаюць, што рускамоўны «арбуз» не мае нічога агульнага з беларускім «гарбузам»? Вучням прапаноўваецца разгараць наступны рэбус. Адказ: «лыжка».



Станцыя «Дзіцячая»

Перад вамі восем дзяцячых кубікаў з літарамі, з якіх трэба скласці слова. Загаданае слова – «гармонік».

Станцыя «Пашуковая»

Цяпер, калі вы адгадалі ўсе словы, вы павінны знайсці гэтыя экспанаты ў музеі (перамяшчэнне групы вучняў у школьны музей). Але шукаем словы ў тым парадку, у якім яны былі вам загаданыя. На кожным з гэтых экспанатах знаходзяцца жоўтыя паперкі з лічбамі. Гэтыя лічбы – парадкавы нумар літары ў назве экспаната, якая нам патрэбна. З гэтых літар пасля будзе складзена слова «ласонікі».

1. каЛыска – 3.
2. сурвэткА – 8.
3. Самавар – 1.
4. кОш – 2.
5. чыгуНок – 5.
6. сальнІца – 6.
7. лыжКа – 4.
8. гармонІк – 7.

Станцыя «Выніковая»

Віншую, вы добра справіліся з заданнем! Загаданае слова – ласонікі. А ці ведаеце вы што гэта такое? У даўнейшыя гады ў беларусаў існавала традыцыя: калі госці прыязджаюць здалёк, то для гаспадароў хаты яны заранёў рыхтавалі гасцінец – рэч, ласунак, якія госць або блізкі чалавек падносіць каму-небудзь як падарунак. У некаторых мястэчках гэтак званыя прысмакі называюць ласонікі.

Вучням дораць салодкія падарункі.

Сёння мы з вамі пазнаёміліся з беларускай мовай, культурай і гісторый нашых продкаў. А за вашую камандную працу атрымалі ласонікі. Дзякуй усім за добрыя вынікі!

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Цікава зазірнуць у мінулае, даведацца, як жылі продкі, душой і сэрцам адчуць спадчыну свайго народа.

У нашай выставе “Беларуская хатка” можна ўбачыць саматканыя посцілкі і вышываныя ручнікі з бабульчыных куфэркаў, гліняныя гладышы і гаршкі, драўляныя рэчы, лапці і шмат іншых цікавых рэчаў, якія раней служылі людзям. Да вясковай печы хочацца дакрануцца рукой: здаецца, яна яшчэ дыхае цяплом, пачаставаўшы гасцей верашчакай, дранікамі, пульхнымі блінамі. Адпачываюць каля сцяны прасніца і калаўрот, падрыхтаваўшы для кроснаў маткі нітак… Маляўнічы куфар разаслаў вясёлкавыя ручнікі, коўдры, абрусы, сурвэткі. Аб калядным свяце мроіць ступа з таўкачамі… Хіба ж не цікава даведацца, з чаго зроблены гэтя лапці, і ці праўда, што іх абувалі на ногі? А што гэта за кола стаіць, няўжо з яго дапамогай рабілі ніткі? Тут, у нашай выставе можна не толькі пачуць цікавую гісторыю пра старыя рэчы, але і ўбачыць работы ўмельцаў.